# Аляксей Ануфрыевіч Дудараў



# Біяграфія

- Нарадзіўся ў сялянскай сям'і калгаснікаў. Скончыў у 1968 годзе Наваполацкае прафесійна-тэхнічнае вучылішча нафтавікоў, працаваў слесарам на нафтаперапрацоўчым заводзе. Скончыў у 1976 годзе Беларускі тэатральна-мастацкі інстытут па спецыяльнасці «акцёр драмы і кіно». Працаваў акцёрам, загадчыкам літаратурнай часткі ТЮГа (1976—1979), членам сцэнарна-рэдакцыйнай калегіі «Тэлефільм» (Мінск, 1976—1983). З'яўляўся сябрам Саюза пісьменнікаў СССР (з 1979). З'яўляецца сакратаром Саюза тэатральных дзеячаў Беларусі (з 1987). Член Беларускага ПЭН-цэнтра (з 1989). У 1991—2002 г. займаў пасаду галоўнага рэдактара часопіса «Мастацтва». З 2003 па 2013 г. з'яўляўся мастацкім кіраўніком Драматычнага тэатра Беларускай арміі.

# Творчасць

- Аўтар п'ес «Выбар» (паст. 1979), «Парог» (паст. 1981), «Вечар» (паст. 1983), «Злом» (1989). П'есы «Апошні ўзлёт» (паст. 1982) і «Радавыя» (паст. 1984) прысвечаны падзеям Вялікай Айчыннай вайны. Трагедыя «Купала» (1994) увасабляе трагізм міжусобнай барацьбы ў ВКЛ напярэдадні Крэўскай уніі 1385, «Адцуранне» (1994) — фантасмагарычны погляд на эсхаталагічную загадку краю і народа. «Песня пра зубра» (1994) — сцэнічная варыяцыя па матывах паэмы М. Гусоўскага. Гістарычныя асобы ў яго творах не пафасна рамантызаваныя, а людзі, падуладныя моцным пачуццям, часам здольныя памыляцца, але ўнутрана годныя.

# Бібліяграфія

- «Кола»: сцэнарый кароткаметражнага фільма (1977)
- «Дэбют»: сцэнарый кароткаметражнага фільма (1978)
- «Суседзі»: сцэнарый мастацкага фільма (1979)
- «Выбар»: п'еса (паст. 1979)
- «Святая птушка»: зборнік апавяданняў (1979)
- «Буслянё»: сцэнарый кароткаметражнага фільма (1980)
- «Сінявочка»: казка для дзяцей (1981)
- «Купальская ноч»: сцэнарый мастацкага фільма (1982)
- «Апошні ўзлёт»: п'еса (паст. 1982)
- «Вечар»: п'еса (паст. 1983)
- «Белыя росы»: сцэнарый мастацкага фільма (1984)
- «Радавыя»: п'еса (паст. 1984)
- «Восеньскія сны»: сцэнарый мастацкага фільма (1986)

# Тэатральныя пастаноўкі

**НАЦЫЯНАЛЬНЫ АКАДЭМІЧНЫ ВЯЛІКІ ТЭАТР ОПЕРЫ І БАЛЕТА:**
2013 — «КНЯЗЬ ВІТАЎТ» (ПАСТАНОЎКА Ю. ТРАЯНА)
**ДНЯПРОЎСКІ АКАДЭМІЧНЫ ТЭАТР ДРАМЫ І КАМЕДЫІ:**
2004 — «В СУМЕРКАХ» (ПАСТАНОЎКА Ж. А. МЕЛЬНІКАЎ)

# Прэміі і ўзнагароды








Узнагароджаны ордэнам «Знак Пашаны» і інш. узнагародамі.
Лаўрэат прэмій Ленінскага камсамола Беларусі (1982) за зборнік апавяданняў «Святая птушка» і п'есу «Выбар», Ленінскага камсамола (1984) за творы апошніх год, Дзяржаўнай прэміі СССР (1985) за спектакль «Радавыя», прэміі Саюзнай дзяржавы ў галіне літаратуры і мастацтва (2002).

# «Князь Вітаўт»

- Гістарычныя асобы, праславіўшыя нашу зямлю, заўсёды цікавілі драматургаў, пісьменнікаў, музыкантаў і жывапісцаў. Адным з цікавых твораў, прысвечаных асобе князя Вітаўта, была п'еса А. Дударава «Купала».
  У 1997 годзе ў Купалаўскім тэатры адбылася прэм'ера спектакля «Князь Вітаўт». Рэжысёр спектакля — Валерый Раеўскі. Музыку да пастаноўкі напісаў кампазітар Віктар Капыцько, дэкарацыі і мастацкае афармленне Барыса Герлавана. Прэм'ерная пастаноўка адбылася 3 жніўня 1997 года, але і сёння цікавасць гледачоў да яе не страчана. У 1998 годзе «Князь Вітаўт» быў паказаны на Міжнародным фестывалі імя А.Чэхава ў Маскве, у 2000 годзе спектакль атрымаў Гран-пры фестывалю «Белая вежа» (г.Брэст). Афармленне сцэны абмежавана трыма злучанымі металічнымі сценамі, якія ў асобныя моманты дзеяння расчыняюцца мноствам дзвярэй. А за імі — то цемра, то струмені святла, то языкі полымя…

# «Князь Вітаўт»

- Падзеі драмы А.Дударава адбываюцца напрыканцы XIV — пачатку XV стагоддзя ў Вялікім княстве Літоўскім. Княства раздзіраюць усобіцы. Кіраўнік дзяржавы вялікі князь Кейстут хоча бачыць сваім пераемнікам сына Вітаўта. Ягайла, уступіўшы ў змову з тэўтонскім ордэнам, нападае на Вільню — тагачасную сталіцу княства. Працягваючы міжусобную вайну, Ягайла займае замак у Троках. Сюды прыходзіць з дружынай Вітаўт, каб прапанаваць мір. Ён яшчэ не ведае, што трапляе ў палон да Ягайлы, які згадзіўся стаць польскім каралём (мужам Ядвігі) і прыняць каталіцтва. У Гародні жонка Вітаўта княгіня Ганна даведваецца ад сваёй пакаёўкі Алены пра бяду, што адбылася з Вітаўтам. Жанчыны выпраўляюцца ў Крэва, дзе за кратамі знаходзіцца Вітаўт. Пераапрануўшыся ў адзенне князя, Алёна застаецца замест яго ў зняволенні. Ратныя поспехі Вітаўта выклікаюць занепакоенасць у Ягайлы, які жадае знішчыць брата. Але, вымушаны падпарадкавацца царкоўным уладам і жаданню жонкі, Ягайла згаджаецца на мір, у выніку якога Вітаўт атрымлівае вялікакняжацкі пасад у Вільні і палітычную незалежнасць Вялікага княства Літоўскага.

# «Князь Вітаўт»

- Героі драмы ўвасабляюць таленавітыя беларускія акцёры: Ягайлу — Мікалай Кірычэнка, Вітаўта — Генадзь Давыдзька, Ядвігу — Вольга Фадзеева, вядзьмарку — Зоя Белахвосцік. Сваімі галасамі, рухамі, пластыкай яны перадаюць характары гістарычных асоб. На сцэне пануе дзіўнае адчуванне чагосьці надрэальнага, міфалагічнага. Важную ролю ў спектаклі адыгрывае музыка кампазітара Віктара Капыцько — яна ўбірае ў сябе ўсе падзеі, што адбываюцца на сцэне. Музыка рэальна ўвасабляе акустычны эфект адкрытай прасторы, з псіхалагічнай дакладнасцю адлюстроўвае расслойванне часу, стварае асаблівую эмацыянальную атмасферу. Своеасаблівы архаічны дух нараджаецца з гучання купальскіх песняў, званоў, грыгарыянікі, гукаў аргана... Спектакль «Князь Вітаўт» — значная з'ява для мастацкага жыцця Беларусі. Ён аказаў на мяне вялікае ўздзеянне. Поспех спектакля ў аднолькавай ступені залежаў ад самазабыўнай ігры акцёраў, рэжысёрскай работы Валерыя Раеўскага, мастацкага афармлення Барыса Герлавана і музыкі Віктара Капыцько. Я раю ўсім паглядзець гэты спектакль.